УДК 821.161.3.09

***Шынкарэнка В. К. (Гомель, Беларусь)***

# ВЫСІ І БОЛЬ ПАЛЕССЯ

*У артыкуле створаны літаратурны партрэт У. Верамейчыка, вядомага паэта палескай зямлі. Вызначана тэматыка і праблематыка яго творчасці, падкрэслена стылѐвая разнастайнасць яго мастацкага таленту. Зроблены акцэнт на актыўнай грамадзянскай пазіцыі У. Верамейчыка, яго ―гатоўнасці маліцца за сваѐ Палессе і ўсю Беларусь‖.*

Таленавіты паэт, яркі публіцыст, бліскучы педагог, выдатнік народнай адукацыі, сапраўдны патрыѐт палескага і ўсяго беларускага краю, безаглядна ўлюбѐны ў яго непаўторныя краявіды, што пазней будуць незваротна знявечаны меліярацыяй і Чарнобыльскай бядой, Уладзімір Міхайлавіч Верамейчык (01.11.1937 – 26.12.1999) нарадзіўся ў в. Петрыцкае Брагінскага раѐна Гомельскай вобласці ў настаўніцкай сям‘і. Калі хлопчыку было каля двух гадоў, яго бацьку арыштавалі як ―ворага народа‖. У рэшце рэшт, пасля доўгіх судовых допытаў Міхасю Рыгоравічу дазволілі вярнуцца на працу ў школу, дзе ѐн займаў пасаду дырэктара да 1939 г. На вайне старэйшы Верамейчык прападзе без вестак. Амаль усе гады ліхалецця і страшэннага голаду асірацелая сям‘я перажыве ў вѐсцы Нахаў Калінкавіцкага раѐна. Маці з вялікай цяжкасцю ўдалося ўладкаваць маленькага сына ў дзіцячы дом. Як узгадвае сам пісьменнік, з часоў вайны і да першага свайго заробку ў яго было толькі адно жаданне: што-небудзь з‘есці. Але ні голад, ні іншыя выпрабаванні не перашкодзяць маладому чалавеку ўсур‘ѐз захапіцца літаратурай, актыўным чытаннем твораў самых розных аўтараў у час вучобы ў Рэчыцкім педвучылішчы.

Пасля заканчэння гэтай навучальнай установы ў 1955 г. У. Верамейчык некаторы час працуе старшым піянерважатым Міхалкаўскай СШ Мазырскага раѐна, потым служыць у арміі (1956 – 1959). Друкавацца пачне з 1955 г. спачатку ў рэчыцкай раѐнцы ―Калгаснік‖, а затым у рэспубліканскай перыѐдыцы. І ўжо першыя спробы пяра пачаткоўца былі з прыязнасцю сустрэты грамадскасцю і прафесійнай крытыкай. Па спецыяльным выкліку за подпісам П. Броўкі паэт прыме ўдзел у нарадзе маладых пісьменнікаў у Каралішчавічах (1957), дзе пазнаѐміцца з Р. Барадуліным, Г. Бураўкіным, У. Караткевічам, Е. Лось, Я. Пархутам, У. Паўлавым, Ю. Свіркам. І гэтыя, і многія іншыя аўтары, што будуць адкрыты У. Верамейчыкам падчас новых знаѐмстваў, стануць для яго вернымі сябрамі на ўсѐ астатняе жыццѐ. Да напісанага імі паэт неаднаразова будзе звяртацца ў сваіх шматлікіх творах.

Пасля дэмабілізацыі У. Верамейчык паступае на філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна, прымае актыўны ўдзел у рабоце літаб‘яднання пры ―Чырвонай змене‖. Пасля заканчэння вучобы ў 1964 г. па ўласнай просьбе размяркоўваецца ў в. Ведрыч Рэчыцкага раѐна, дзе, як быў перакананы сам паэт, сышлася ―клінам зямля‖ і дзе ѐн нязменна працаваў усѐ сталае жыццѐ на пасадах выкладчыка роднай мовы і літаратуры, а пазней завуча і дырэктара. Невыпадкова сѐння Ведрыцкая школа носіць ганаровае імя гэтага адданага сваѐй справе настаўніка і пісьменніка.

Літаратурная спадчына У. Верамейчыка прадстаўлена зборнікамі вершаў і паэм ―Прыпяць‖ (1973), ―Яснасць‖ (1978), ―Люблю!‖ (1981), ―Клянуся Прыпяццю‖ (1988), ―Ліхаўня‖ (1997), публіцыстычнымі кнігамі ―Гарызонты сельскіх педагогаў: запіскі

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

дырэктара школы‖ (1984), ―Жыву школаю‖ (1991). Звяртаўся пісьменнік таксама да жанраў сатырычнага верша і байкі (зб. ―Магарыч‖, 1994); гумарэскі, фельетона, апавядання (зб. ―Карчы Гіменея‖, 1991); актыўна выступаў у друку з крытычнымі артыкуламі. Праз усѐ сваѐ жыццѐ пранѐс У. Верамейчык любоў да Радзімы, да Бацькаўшчыны, дарагіх палешукоў і найпрыгажэйшых краявідаў Палесся, Мазыра, няўрымслівай хуткаплыннай Прыпяці. Як некалі Міхалкі падарылі пісьменніку сяброў Аляксея Краўчанку і Анатоля Ярашэўскага, так і Мазыршчына падарыла яму самую вялікую любоў і зачараванасць жыцця – залатабруйную Прыпяць з усім яе вялікім неспакоем, разлівамі, бязмежнай сінеччу хваль і гайсаннем ветру-гаваруна, стаўшы для самога творцы вусцем і вытокам. Адметна, што прачулае слова развітання са сваім верным сябрам, ―дыпламатам праўды, дыпламатам розуму‖ У. Верамейчыкам Анатоль Кудравец назаве менавіта так: ―Я Прыпяці і вусьце і выток‖ [1, с. 155].

Апошнім зборнікам, што выйшаў яшчэ пры жыцці аўтара, стала ―Ліхаўня‖. У яе ўвайшлі вершы рознага тэматычнага гучання, а таксама аднайменная паэма, прысвечаная маці пісьменніка – Соф‘і Данілаўне Збароўскай, ураджэнцы вѐскі Ліхаўня Нараўлянскага раѐна, што, як і многія вѐскі ў самых розных рэгіѐнах Беларусі, знікла ў ―нікуды‖ пасля страшнай Чарнобыльскай трагедыі. Сціпласць, улюбѐнасць у свой непаўторны палескі край адчуваецца ў кожным творы пісьменніка. Няма ніякага сумнення ў тым, што родныя мясціны і звязаныя з імі перажыванні пакінулі ў душы аўтара незабыўны і глыбокі след. Прычым частае выкарыстанне дакладных геаграфічных найменняў нікольки не шкодзіць лірычнаму пачатку паэзіі У. Верамейчыка, якую даследчыкі не без падстаў называюць ―першароднай і запаветнай, роснай і ўкоснай, празрыстай і вірлівай, неўтаймаванай і гарачай‖ [2, с. 5].

Пераважная большасць вершаў зборніка прысвечана бязмежна дарагім мясцінам, дзе аўтар правѐў большую частку свайго жыцця. Іншы раз У. Верамейчык занатоўвае ў паэтычных тэкстах асноўныя вехі ўласнай біяграфіі, няпростай гісторыі сям‘і і такім чынам вынаходзіць свае Бермуды, свой ―Палескі трохкутнік‖. Пры гэтым дзеля паўнаты інфармацыйнага паведамлення, што прадстае на фоне лірычна-разгорнутага і ўзмоцненага паўторамі светлага вобразнага малюнка, паэт гатовы часта ахвяраваць рыфмай, роўнаскладовасцю радкоў і іх структурным афармленнем:

Маці мая нарадзілася ў светлай Нароўлі,
У Брагіне светла-зялѐным убачыў я свет,
Сын мой зачаты ў Хойніках светла-ружовых… [3, с. 43].

Літаральна  праз радок дарагія сэрцу аўтара тапонімы зменяцца на нябачныя і зусім іншыя па сутнасці і фарбах, але з уласнымі імѐнамі нуклідныя рэаліі, якія засведчаць знікненне гармоніі і ўсюдыісную прысутнасць смерці ў навакольным свеце, самім палескім трохкутніку, што займелі кантрастны папярэдняму светламу чорны колер: Стронцый, Плутоній і Цэзій упалі з нябѐсаў, Густа засыпалі атамнай соллю палеткі, лугі.

Прыпяць, Славечна, Брагінка і безліч рачулак
Ў мулкіх нуклідных пасцелечках выснілі страшныя сны.
Знікла гармонія… [3, с. 43].

Апакаліптычная карціна постчарнобыльскай рэчаіснасці і чорнага палескага трохкутніка з персаніфікаванымі вобразамі Стронцыя, Цэзія, Плутонія настолькі жахлівая, што ―Я‖-герой твора звяртаецца на каленях да Бога з просьбай вярнуць яму і народу ―Хойнікі, / Брагін, / Нароўлю… / Чыстымі, / чыстымі, / чыстымі…‖ [3, с. 43].

Увогуле, асэнсаванне наступстваў Чарнобыльскай трагедыі з‘яўляецца адной з галоўных тэм паэзіі У. Верамейчыка (вершы ―Беларусі‖, ―Зона‖, ―Санаторый

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

―Бярэсце‖ і інш.). Асабліва пераконвае ў гэтым паэма ―Ліхаўня‖, глыбокі змест і эмацыянальная ўзрушанасць ад прачытання якой прымушае ўзгадаць лепшыя творы беларускага ліра-эпасу адпаведнай тэматыкі. Найперш паэмы М. Башлакова, В. Зуѐнка, К. Жука, А. Зэкава, С. Законнікава, М. Мятліцкага, У. Някляева, Я. Сіпакова і іншых.
З сумным настроем і нават тужлівым надрывам лірычны суб'ект паэмы У. Верамейчыка ўспамінае тыя шчаслівыя хвіліны, што правѐў у чыстым палескім лесе, ля рэчкі Славечны з яе празрыстай і цудадзейнай вадой.

На скрыпцы журлівай прастораў Палесся
Славечна – адна залатая струна,
Што грае ў полі, што плача ў лесе
Ад рання да вечара і давідна. [3, с. 68].

Лірычны суб'ект твора адчайна спадзяецца на цуд, марыць убачыць дарагую сэрцу ―Ліхаўню жывой і шчаслівай...‖ [3, с. 63]. Тую самую Ліхаўню, якая ў адзін з красавіцкіх дзѐн стала атамнай Хатынню, запалоненай Цэзіем, Стронцыем, Плутоніем, з нейтроннай маннай на плячах. Разам з Чарнобыльскай аварыяй на Палессі і іншых рэгіѐнах Беларусі амаль адразу знікла ранейшае жыццѐ. Усѐ навокал атручана, а таму стала нікому не патрэбна. Здаецца, лугі і лясы, палі і сады па-ранейшаму працягваюць квітнець, але гэтага ўжо ніхто не бачыць. Вакол ніводнай душы, якую магла б уразіць багаццем сваіх выяў гэтая небяспечная для чалавека прыгажосць раслінна-прыроднага, зямнога і воднага, матэрыяльна-рэчыўнага свету. І ўсѐ ж герой не пакідае марыць аб вяртанні-адраджэнні яго малой радзімы, як і многіх іншых пахаваных у выселеных зонах беларускіх вѐсак.

І будуць здаровыя рыбы
З шчаслівымі дзецьмі купацца, І
яблыкаў, груш неатрутных
Кашамі ў дом пананосяць. І бэз
зацвіце не нукліднЫ
Ля кожнай шчаслівае хаты.
І будзе вялікае свята… [3, с. 77].

Адказнасць, трывога за будучы лѐс прыроды, якую з кожным годам усѐ болей і болей забруджваюць, вынішчаюць, выразна адчуваецца ў вершы У. Верамейчыка ―Размова з меліяратарам‖. Чарнобыльская тэма тут цесна знітавана з экалагічнай. Лірычны герой паэта, звяртаючыся са словамі асуджэння да асушальнікаў балот, задаецца балючым пытаннем: як выратаваць гэтае восьмае цуда свету – Прыпяць, Палессе? Яго хвалююць замах на неруш, чалавечая абыякавасць да нерукачыннага свету, нядбайныя адносіны да зямлі, вады, акаляючай атмасферы, што паўсюдна нішчацца, на нашых вачах паміраюць. Але ж ад кожнага з нас залежыць тое, якім будзе ўніверсум праз гады і дзесяцігоддзі, як планета сустрэне нашых нашчадкаў у далѐкай будучыні.

Асобнае месца ў творчасці пісьменніка займае мазырская тэма. У адным з інтэрв'ю карэспандэнту ―Гомельскай праўды‖ У. Верамейчык прызнаваўся, што любоў да Прыпяці і Мазыра ў яго яшчэ з ураджанняў ранняга дзяцінства, калі туды яго везлі ратаваць ад голаду. Пра Мазыршчыну паэт піша вельмі шчыра і амаль заўжды ў сукупнасці з прыгажуняй-Прыпяццю, ―размах і апантанасць‖ якой не можа не зачароўваць. На гэта ўказвае і назва першай паэтычнай кнігі аўтара – ―Прыпяць‖. Загадкавая палеская рака стала для У. Верамейчыка другой маці. Яна – юнацкае захапленне, першая каханка, галоўная крыніца творчага натхнення, ―восьмае цуда зямлі‖, адхланне, што дазваляе не памятаць пра смерць (―Над Прыпяццю‖, ―Размова з меліяратарам‖). Трэба заўважыць, што паэт не з'яўляецца першапачаткоўцам у раскрыцці гэтай тэматыкі (да яго пра ―беларускую Швейцарыю‖

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины

пісалі Я. Купала, В. Вольскі, У. Дубоўка, І. Навуменка, У. Краўчанка, У. Караткевіч, А. Бароўскі  і інш.). Аднак гэтак пранікліва і яскрава адлюстраваць усю загадкавасць, прывабнасць і прыгажосць краю, здаецца, змог толькі У. Верамейчык. З захапленнем апяваючы мілыя сэрцу краявіды, землякоў, ―незабыўныя стромы‖ сталіцы Палесся, а яны для лірычнага героя вышэй, ―чым Памір і Каўказ‖, аўтар стварае персаніфікаваны вобраз горада. Мазыр, асабліва прыгожы вясною, ―у бэзавай імгле‖, паўстае сведкам самых патаемных мар, думак і спадзяванняў месцічаў, духоўным вартаўнікам усяго Палесся (вершы ―Журналіст‖, ―Мазыр‖, ―Вартуй, Мазыр‖ і інш.).

Асобнае месца ў творчасці У. Верамейчыка займае Мазырскі педагагічны інстытут (зараз педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна). Пра заснаванне і гісторыю гэтай навучальнай установы паэт шмат пісаў у сваіх нарысах, сюды ѐн часта і з ахвотаю прыязджаў на літаратурныя вечарыны, сустрэчы са студэнтамі і выкладчыкамі. Вершпрысвячэнне ―Мазырскаму педінстытуту‖ ўяўляе сабой своеасаблівы запавет, летапіс гісторыі яго ўзнікнення і далейшага развіцця. Не менш вобразнымі, пяшчотнымі і прыгожымі паўстаюць у вершах У. Верамейчыка жанчыны-мазыранкі. Так, паэт абагаўляе клапатлівыя і ласкавыя рукі медсясцѐр, якія выратавалі яго жыццѐ (―Мазырскім медыцынскім сѐстрам‖). Але ў большасці твораў, незалежна ад прафесійных захапленняў, сацыяльнага статусу сваіх лірычных гераінь, пісьменнік аднолькава ставіцца да іх з непрыхаваным замілаваннем і цѐплымі пачуццямі (―Аловак‖, ―Зімовы санет-акраверш‖, ―Баюся Васілевіч‖). Здаецца, ―Я‖ паэта пакідае за сабой з усяго багацця Палесся ―няўрымслівай Прыпяці ход‖ ці не адзіна з тым, каб такім чынам гарантаваць сустрэчу з каханай ―і праз некую тысячу год‖ (―Жанчыне з Мазыра‖, [3, с. 39]).

Шмат вершаў, змешчаных у зборніку ―Ліхаўня‖, пададзена ў форме прысвячэнняў паэтам-сябрам і аднадумцам. Сярод іх – Р. Барадулін, І. Гарыст, Л. Дранько-Майсюк, У. Дударэнка, Л. Кругаўцова, У. Лазарэвіч, Е. Лось, А. Малюк, І. Навуменка, А. Рабцаў, В. Самсоненка, Ф. Саўка, В. Сяліцкі, Н. Тужык, Б. Ціхановіч, Г. Шарай і інш. Настальгіяй па маладосці гучыць верш ―Мазырскі трамвай‖, адрасаваны даўняму сябру А. Ярашэўскаму. Нібы пры дапамозе фантастычнай машыны часу, аўтар вяртаецца ў незабыўныя часы свайго юнацтва. Адным з адметных твораўпрысвячэнняў з‘яўляецца ―Помнік невядомаму мазыраніну‖. Гэта – верш пра тых не ўвекавечаных у помніках і мемарыялах сваѐй эпохі, здольных на ўласны пратэст і абвяржэнне галоднай пасляваеннай сталінскай рэчаіснасці мужных людзей, адчайныя ўчынкі якіх і сталі сведчаннем хуткага звяржэння ранейшых ідалаў, неабходнасці далейшай перабудовы ў грамадстве.

Па-новаму асэнсоўваюцца У. Верамейчыкам крывавыя 1941–1945 гады ва ―Успамінах пра вайну‖. Верш адрасаваны Барысу Ціхановічу, непасрэднаму ўдзельніку падзей таго трагічна-гераічнага, напоўненага шматлікімі выпрабаваннямі часу. У ―Таполях юнацтва‖ паэт з павагай звяртаецца да ваеннага лѐсу і зробленага ў літаратуры заўжды маладым і летуценным І. Навуменкам, а таксама выказвае спадзеў на будучы плѐн творчасці палескага рамантыка, на тое, што мір навекі ўсталюецца на ўсѐй зямлі.

Хвалюе У. Верамейчыка і тэма вѐскі, якая з апошніх сіл трымаецца на энтузіязме адданых ѐй людзей. Паэт гатовы цалаваць ―парэпаныя рукі‖ даярак, схіляе голаў перад астатнімі яе працаўнікамі, што часта трапляюць у няпростыя жыццѐвыя сітуацыі, месяцамі не атрымліваюць грошы за здадзеную прадукцыю, у тым ліку і ―дзякуючы‖ добрым чыноўнікам і старшыням (―Сельскай гаспадарцы‖).

Асабліва часта пісьменнік задумваецца над сіроцкім становішчам матчынай мовы ў роднай краіне, наогул над няўпэўненым самапачуваннем беларуса ў Беларусі. З тым, каб дарэшты асэнсаваць працэсы сучаснага яму грамадства, аўтар імкнецца зазірнуць у

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

мінулае, дакарае беларусаў за здраду непаўторнай і самабытнай роднай мове, якая чамусьці часта не месціцца ў школьны расклад, бяздумна замяняецца іншымі. У выніку самі трапляем у непрыемныя і недарэчныя сітуацыі, ня̀ёмкае становішча, бо ніколі не замяніць, не быў і не стане Сямѐн-музыкант ―раднѐю Сымонумузыку‖ (―Беларуская мова‖, [3, с. 5]).

Нялѐгкай працы педагога, настаўніка ў шырокім разуменні гэтага слова, які аддае сваім вучням не толькі веды, але і сардэчны неспакой, душэўныя клопаты, прысвечаны вершы зборніка ―Беларускі настаўнік‖, ―Малітва‖, ―Паездка ў Тураў да настаўніка беларускай мовы Фѐдара Міхайлавіча Саўка‖, ―Школьны званок‖. У вершы ―Малітва‖ ў напаўгумарыстычнай форме паэт звяртаецца да Бога і просіць у яго для настаўнікаў шчадрот. Сярод іх найперш належную зарплату, мудрага дырэктара, добрых вучняў, расклад без фортак, цѐплую хату, годны адпачынак. Тым самым У. Верамейчык падкрэслівае, што незаўсѐды ў нашым жыцці гэтыя людзі атрымоўваюць заслужаныя павагу, пашану ад сваіх выхаванцаў і дзяржавы. Тым не менш, найлепшыя з іх нястомна і сціпла працягваюць сцвярджаць сваѐ педагагічнае прызванне, здзяйсняць справу выхавання, нікому не скардзячыся і ніколькі не крыўдуючы на цяжкі лѐс. Вобраз настаўніка ў творчасці У. Верамейчыка – найперш асоба, шчыра адданая працы, інтэлігентны чалавек, які імкнецца зрабіць усѐ неабходнае для таго, каб мудрае, добрае, вечнае абавязкова дало новыя ўсходы на ўрадлівай глебе дзіцячых сэрцаў, каб у іх сеялася, прарастала, множылася Вера, Надзея, Любоў (―Беларускі настаўнік‖).

Удумлівай роздумнасцю над складанымі і супярэчлівымі пытаннямі сучаснасці прасякнуты творы пісьменніка ―Да адмены купонаў‖, ―На трасе жыцця‖. У першую чаргу лірычны суб‘ект пералічаных вершаў імкнецца нагадаць нам, што чалавечае шчасце складаецца не з матэрыяльных атрыбутаў, а са звычайных шчырых пачуццяў і паважлівых адносін людзей адзін да аднаго. Герой-паэт марыць пра здзяйсненне для сябе напрыканцы жыцця трох запаветных мар, трох жаданняў: перачытаць шэсцьдзесят шосты санет Шэкспіра, памерці на службе героем у імя выратавання роднай краіны і каб на могілках апошняе развітальнае слова для яго было сказана добрым сябрам – Рыгорам Барадуліным (―Тры жаданні‖).

Са з‘едлівай сатырай У. Верамейчык адмаўляе патрэбу грамадства ва ўсякага кшталту дэмагогах, тарбахватах, чыноўніках-бюракратах, якія ―сталі чырвонымі памешчыкамі‖ і на даходлівых пасадах набіваюць сабе кішэні, забываючыся на тое, што пастаўлены перш за ўсѐ для служэння народу (―Сельскай гаспадарцы‖, ―Расстрэл бюракрата‖). Пісьменнік бязлітасна выкрывае такія шматлікія вострыя і злабадзѐнныя пытанні сучаснасці, як п‘янства і хабарніцтва, гультайства і ашуканства, калі замест працы кіраўнікі імкнуцца хіба толькі добра адпачыць, жывуць для сябе, а перад падначаленымі ―цытуюць ўзахлѐб Міхаіла Сяргеіча…‖ (―Навагодняе‖, [3, с. 5]). У выніку ніякіх зрухаў да лепшага ў грамадстве не адбываецца: уся вытворчасць, працоўныя справы, даходы простых людзей стаяць на адным месцы ці змяняюцца да горшага (―Інфляцыя‖). У сувязі з гэтым лірычны суб‘ект У. Верамейчыка робіць выснову: для далейшага росквіту і плѐну руплівых і карысных спраў сапраўдных майстроў павінны ―знікнуць абібокі-дрываломы‖ (―Дрывяных спраў майстры‖, [3, с. 18]).

Трэба прызнаць, што У. Верамейчык заўсѐды ставіўся да літаратурнай творчасці, аднолькава як і да выкладчыцкай працы, абавязкаў кіраўніка, сур‘ѐзна і строга (―Мясцовы паэт‖, ―Паэтам‖ і інш.). Магчыма, па гэтай прычыне ў вершы ―***Не старайцеся стаць у сямнаццаць паэтам…‖ пісьменнік раіць пачаткоўцам не спяшацца друкавацца, папярэдне не засвоіўшы майстэрства заўважаць ―кожную дробязь і рыску‖, не набыўшы ―шчырасць

голасу‖, не навучыўшыся ―выплаўляць / слоў / трывожную / медзь‖ [3, с. 49]. Сам У. Верамейчык з усёй адказнасцю рыхтаваў свае творы да выхаду ў свет. І такі падыход да пісьменніцкай справы цалкам апраўданы. Як вядома, сапраўдная паэзія вызначаецца не колькасцю прадстаўленых радкоў, а іх вартасцю, удумлівым стаўленнем аўтара да праблем быцця, сілай эмацыйнага ўздзеяння на чытача, уменнем закрануць самае істотнае, балючае, тонкае. Менавіта пералічаныя якасці, а таксама адкрытая грамадзянская пазіцыя, гатоўнасць маліцца за сваѐ Палессе і ўсю Беларусь, душэўная пранізлівая інтанацыя і робяць паэтычны голас У. Верамейчыка пазнавальным і адначасова адметным сярод многіх іншых.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Кудравец, А. Я Прыпяці і вусьце і выток / Анатоль Кудравец // За дальнім прычалам. Літаратурныя партрэты. – Мінск: Медысонт, 2007. – С. 150–164.

2. Коласаў, Л. Жыў тут народ белакуры / Л. Коласаў // Голас Радзімы. – 1995. – № 51 – 52. – С. 5.

3. Верамейчык, У. Ліхаўня: Вершы і паэма / Уладзімір Верамейчык. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 78 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ имени Ф. Скорины